УДК 373.1

# ПАТЭНЦЫЯЛ УРОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў РАЗВІЦЦІ МЕДЫЯПІСЬМЕННАСЦІ ВУЧНЯЎ

**Ю. С. Паўлава**

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гімназія № 1 г. Барысава»,*
*б-р Грэчкі, 28, 222511, г. Барысаў, Беларусь, julietta78@mail.ru*

Артыкул прысвечаны раскрыццю важнай праблемы, звязанай з фарміраваннем медыяграматнасці вучняў у працэсе навучання беларускай літаратуры. Прыводзяцца кароткія тэарэтычныя звесткі аб розных аспектах медыяграматнасці, а таксама разглядаюцца прыклады выкарыстання розных відаў медыятэкстаў на ўсіх этапах урока. Можа быць выкарыстаны настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры, якія імкнуцца разнастаіць свае заняткі, зрабіць іх больш цікавымі для вучняў, развіваць не толькі прадметныя кампетэнцыі, але і медыяграматнасць.

***Ключавыя словы:*** медыякампетэнцыя; медыяграматнасць; медыятэксты; крытычнае мысленне.

# THE POTENTIAL OF BELARUSIAN LITERATURE LESSONS IN MEDIA LITERACY EDUCATION

**Y. S. Pavlova**

*Gymnasium № 1 of Borisov,*
*Grechko Boul., 28, 222511 Borisov, Belarus, julietta78@mail.ru*

This article pays attention to an important problem of formation and developing media literacy while teaching Belarusian literature. The article provides brief theoretical information on various aspects of media literacy, as well as the examples how to use different types of media texts at all stages of the lesson. The article is for teachers of the Belarusian language and literature who want to make lessons more interesting for students, develop not only subject competencies, but also media literacy.

***Key words:*** media competence; media literacy; media texts; critical thinking.

Праблема фарміравання медыяграматнасці вучняў сёння стаіць асабліва востра, бо сродкі масавай інфармацыі часам адыгрываюць больш важную ролю ў выхаванні і адукацыі дзіцяці, чым бацькі або педагогі. Сёння немагчыма быць ізаляваным ад медыя. Безумоўна, меў рацыю нямецкі сацыёлаг Ніклас Луман, калі казаў: «Тое, што мы ведаем аб нашым грамадстве і нават аб свеце, у якім мы жывем, мы ведаем са сродкаў масавай інфармацыі». У гэтым патоку інфармацыі часам губляемся нават мы, дарослыя. Што ж казаць пра нашых дзяцей? Ці ўмеюць яны фільтраваць інфармацыю, атрыманую з розных СМІ, ці здольны не толькі бачыць і чуць, але і аналізаваць, крытычна ацэньваць яе? Гэтаму можна і трэба вучыць. Медыяграматнасць не адмаўляе традыцыйную граматнасць, якую дае школа, а пашырае яе адпаведна

патрэбам сучаснага грамадства.

Медыяадукацыя ўзнікла як шлях дапамогі вучням, якія жывуць у інфармацыйным грамадстве, залежаць ад тэхналогій, гэта выхаванне ў іх здольнасці глядзець на свет самастойна і прымаць свае ўласныя рашэнні.

Медыяграматнасць – гэта сукупнасць навыкаў і ўменняў, якія дазваляюць людзям знаходзіць патрэбнае, аналізаваць, ацэньваць паведамленні ў розных відах медыя, жанрах і формах, а таксама ствараць такія паведамленні [1, с. 11].

Такім чынам, медыяадукацыя – гэта працэс, а медыяграматнасць – вынік адпаведнай адукацыйнай практыкі [1, с. 12].

Медыяадукацыя, па меркаванні А. В. Фёдарава, «…у сучасным свеце разглядаецца як працэс развіцця асобы з дапамогай і на матэрыяле сродкаў масавай камунікацыі (медыя) з мэтай фарміравання культуры зносін з медыя, творчых, камунікатыўных здольнасцей, крытычнага мыслення, уменняў паўнавартаснага ўспрымання, інтэрпрэтацыі, аналізу і ацэнкі медыятэкстаў, навучання розным формам самавыяўлення пры дапамозе медыятэхнікі» [2, с. 23].

Медыяграматнасць – сукупнасць навыкаў і ўменняў, якія дазваляюць людзям аналізаваць, ацэньваць і ствараць паведамленні ў розных відах медыя, жанрах і формах. Задача медыяадукацыі – спрыяць фарміраванню медыйнаадукаванага маладога чалавека [2, с. 25].

Зразумела, пры навучанні медыяграматнасці найперш трэба паказаць вучням, якую ролю медыя адыгрываюць у іх жыцці. Ды і самім настаўнікам не перашкодзіць пераканацца, што медыяграматнасць – не чарговая мода, а адзін з самых неабходных навыкаў выжывання ў інфармацыйным свеце, якому павінна вучыць школа.

Таму фарміраванне медыякампетэнцый стала адным з прыярытэтных напрамкаў у сферы маёй педагагічнай дзейнасці.

Такім чынам, можна вызначыць актуальныя на сённяшні дзень медыякампетэнцыі:

- пошук інфармацыі,уменне вызначаць галоўную думку, крытычная ацэнка, вызначэнне сапраўднасці інфармацыі;
- уменне адрозніваць факты ад іх інтэрпрэтацыі; супрацьстаянне маніпуляцыям;
- інфармацыйны этыкет; стварэнне ўласных медыятэкстаў.

Гэта прадугледжвае тое, што вучні павінны ўмець ствараць медыяпрадукты, маючы пры гэтым неабходныя веды пра законы гуказрокавага ўспрымання, крос-культурнай камунікацыі; валодаць медыяканвергентнымі навыкамі, паняццем інфаэтыкі і быць гатовымі да

бяспечнага выкарыстання медыятэкстаў для павышэння ўзроўню сваёй адукаванасці [1, с. 32].

Як настаўнік імкнуся на ўроках і пазакласных мерапрыемствах вучыць дзяцей працаваць з медыятэкстамі. Зразумела, на розных этапах урока настаўніку трэба выкарыстоўваць розныя метады і прыёмы работы з імі.

На **арыенціровачна-матывацыйным этапе**, задачы якога сфарміраваць матывацыю, стварыць умовы для самавызначэння вучняў на мэту ўрока, добра адразу стварыць праблемную сітуацыю для пагружэння ў тэму. Напрыклад, паказаць вучням *малюнак ці карыкатуру* і спытаць, чаму менавіта яны абраны сімвалам урока.

Часта ў інтэрнэце можна знайсці *фотаздымкі і плакаты з памылкамі*. Вучням будзе цікава паглядзець на білборд, на назвы вуліц, кафэ, прыпынкаў, знайсці памылку, прапанаваць правільны варыянт напісання. Напрыклад, на адным білбордзе замест выявы Якуба Коласа, пра якога ішла гаворка, быў размешчаны фотаздымак Янкі Купалы.

*Ключавыя пытанні* на пачатку ўрока таксама заахвочваюць і матывуюць вучняў да пошуку адказаў на іх. Напрыклад, на ўроку, прысвечанаму падзеям Вялікай Айчыннай вайны варта звярнуцца да *скульптурных кампазіцый*, аб'яднаных у трыпціх «Тыл-фронту», «Радзіма-маці заве», «Воін-вызваліцель» і прапанаваць ключавое пытанне: якая агульная ідэя гэтых трох скульптурных кампазіцый?

*Праца з эпіграфам* – асобны від работы, які можна выкарыстаць у пачатку ўрока. Варта не проста запісаць на дошцы эпіграф ці цытату вядомага чалавека, а і прадэманстраваць яго фотаздымак, распавесці некалькі слоў пра аўтара.

На **аперацыйна-пазнавальным этапе**, задача якога стварыць умовы для актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў, паспяховага выканання ўсіх заданняў урока, можна прапанаваць некалькі варыянтаў работы з рознымі відамі медыятэкстаў.

Шмат чаго могуць расказаць *фотаздымкі*. Карысным будзе прапанаваць, напрыклад, вучням здымак Васіля Быкава ў ваеннай форме з медалямі, якія ён атрымаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, чым звычайны фотаздымак пісьменніка, а затым ужо расказаць пра яго жыццёвы і творчы шлях.

Прыём *«Медыяазбука»* развівае вобразнае мысленне, інтэлектуальныя здольнасці вучняў, пашырае агульны кругагляд. Медыяазбука – гэта віктарына з выкарыстаннем розных відаў медыятэкстаў (малюнкаў, фатаграфій), якія служаць падказкай для адказу на пытанне. Пытанні да

такой віктарыны павінны быць зададзены так, каб адказы адпавядалі літарам алфавіта.

Прыём *«15 малюнкаў»*. Вучні працуюць у групах і атрымліваюць канверт з малюнкамі. Сярод іх трэба выбраць толькі тыя, якія прадстаўляюць вобразы пэўнага верша. Затым вучням прапануецца стварыць сваю інтэрпрэтацыю дадзеных вобразаў.

*Правакацыйныя пытанні, якія суправаджаюцца фотаздымкам.* Вучням прапануецца адказаць на пытанне тыпу «Ці можа быць такое?...Аўтар падручніка па вышэйшай матэматыцы выдала кнігу пра Янку Маўра». Вучні прапануюць свае варыянты, а потым настаўнік агучвае правільны адказ: Марыя Міхайлаўна Міцкевіч – унучка Янкі Маўра і Якуба Коласа. Яе маці Наталля Іванаўна – дачка Янкі Маўра, а бацька Міхась Канстанцінавіч – сын Якуба Коласа. Яна сама матэматык, а выдала кнігу пра свайго знакамітага дзядулю.

*Цікавыя факты пра пісьменніка.* Разам з фотаздымкам пісьменніка дэманструюцца цікавыя факты пра яго жыццёвы шлях. Напрыклад, Аркадзь Куляшоў меў італьянскія карані, яго прадзед быў сынам італьянца-арганіста, прывезенага з Польшчы. Таксама Куляшоў любіў спяваць дуэтам з Петрусём Броўкам падчас сяброўскіх пасядзелак.

Вучням карысна і цікава будзе даведацца пра тое, *кім працавалі беларускія пісьменнікі да таго, як сталі знакамітымі.* Напрыклад, Аляксей Дудараў быў слесарам на нафтаапрацоўчым заводзе.

*Малюнак як медыятэкст.* Вучням прапануецца разгледзець малюнак Г. Вашчанкі «Мацярынскія крылы» і паразважаць, што дазваляе суаднесці яе з нарысам У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі?» і г. д.

*Помнік як медыятэкст.* Вучні разглядаюць помнікі вядомым людзям (А. Міцкевіч, Ф. Скарына і г. д.) ці падзеям (Вялікая Айчынная вайна, помнікі матулям, Халакост і г. д.), а далей адказваюць на шэраг пытанняў, тыпу пра што нам распавядаюць дэталі: сімвалы, адзенне, фігура? Якія каштоўнасці трансліруе помнік?

*Прыём «Анкета героя»*, калі пэўнаму герою ствараецца характарыстыка з дапамогай анкетных дадзеных. *Старонка героя УКантакце,* дзе таксама на аснове анкетных даных вучні прыдумваюць і ствараюць профіль героя ў інтэрнэце.

*Работа з філвордамі.* Гэта разнавіднасць крыжаванкі ў выглядзе поля з наборам літар. Вучням прапануецца знайсці схаваныя ў філвордзе словы (напрыклад зашыфраваць словы па тэорыі літаратуры, прапанаваць вучням знайсці іх усе, а затым двум-тром паняццям даць

азначэнне).

На **кантрольна-карэкцыйным этапе**, задача якога стварыць умовы для кантролю, праверкі і карэкцыі ведаў, уменняў і спосабаў дзеянняў добра выкарыстаць творчае ці тэставае заданне. Напрыклад, можна прапанаваць вучням адгадаць *фільм па кадры*, запісаць назву фільма, назву кнігі, аўтара, галоўных герояў. Добра падыдзе і *воблака слоў*. Тут можна прапанаваць запісаць асноўныя паняцці па вывучанай тэме, а можна ўключыць лішняе слова, не звязанае з тэмай урока і папрасіць, каб вучні яго знайшлі.

Таксама можна прапанаваць *тэкст з белымі плямамі, параўнальныя характарыстыкі герояў твора з дапамогай кругоў Эйлера-Вена, пошук недакладнасцей у тэксце, разгадку твора па смайліках і інш.*

На этапе **інфармацыі пра дамашняе заданне**, задача якога стварыць умовы для ўсвядомленага выбару дамашняга задання і яго паспяховага выканання, вучням можна прапанаваць заданні творчага характару. Напрыклад, прыдумаць і намаляваць *вокладку* да кнігі (Я. Купала «Курган», З. Бядуля «На Каляды к сыну» і г. д.) ці *стварыць рэкламу для кнігі*.

Таксама цікавае заданне для вучняў *буктрэйлер* – кароткі відэаролік, які ў вольнай форме расказвае пра якую-небудзь кнігу. Каб стварыць рэкламны відэаролік, вучням трэба добра папрацаваць: прадумаць змест, фотаздымкі, уставіць фрагменты фільма (калі твор быў экранізаваны) і г. д. Адным словам, прыдумаць яркую візуальную рэкламу кнігі з цікавым зместам.

На этапе **падвядзення вынікаў, рэфлексіі**, задача якога стварыць умовы для развіцця рэфлексіўнай дзейнасці, добра падыходзіць прыём воблака слоў, які можна замяніць *воблакам эмоцый*. На гэтым этапе таксама вучням можна прапанаваць стварыць *уласнае выказванне* «Каму б ты параіў прачытаць апавяданне? Чаму?»

Такім чынам, прымяненне медыятэкстаў на розных этапах урокаў беларускай літаратуры адкрывае вялікія магчымасці для пашырэння адукацыйных рамак па прадмеце, дазваляе зрабіць урок цікавым, насычаным, спрыяе фарміраванню ў вучняў навыкаў работы з рознымі інфармацыйнымі крыніцамі і крытычным стаўленнем да іх.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Медыяадукацыя ў школе: Фарміраванне медыяграматнасці вучняў: дапаможнік для настаўнікаў / М. І. Запрудскі [і інш.]; пад рэд. М. І. Запрудскага. Мінск, 2016.

2. *Фёдоров А. В.* Медиаобразование: История, теория и методика. Ростов-на-Дону : Изд-во ЦВВР, 2001.

3. *Кузьмина М. В.* Деятельность медиацентра современной школы в условиях ФГОС второго поколения // Образование в Кировской области. 2013. № 3 (27). 68 с.

4. Медыяадукацыя ў сучаснай школе: зб. навукова-метадычных артыкулаў / Т. Ваврава [і інш.]; пад рэд. М. Запрудскага. – Мінск, 2016.